Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (97), 2016

*УДК 94(476)[338.2:67]–053.81*

# Моладзь у прамысловасці Савецкай Беларусі ў гады ажыццяўлення новай эканамічнай палітыкі

В.В. Даніловіч

Праведзены аналіз становішча моладзі ў прамысловасці Савецкай Беларусі ў перыяд ажыццяўлення новай эканамічнай палітыкі (1921–1927 гг.). Акцэнт зроблены на дзейнасці дзяржавы, камсамола і прафсаюзаў па працаўладкаванні юнацтва на дзяржаўных і прыватных прамысловых прадпрыемствах, абароне правоў маладых рабочых. У артыкуле сцвярджаецца, што, нягледзячы на паступовае паляпшэнне матэрыяльнага становішча і рост прафесіяналізму рабочых юнакоў і дзяўчат, яны падоўгу затрымліваліся ў ніжэйшых кваліфікацыйных разрадах, часта былі заняты на некваліфікаванай працы. Агульная колькасць рабочай моладзі адносна колькасці ўсіх прамысловых рабочых заставалася невялікай, большасць юных рабочых былі яўрэйскай нацыянальнасці і працавалі ў дробнай прамысловасці.
**Ключавыя словы:** прамысловасць, прадпрыемствы, рабочыя, саматужнікі, моладзь, падлеткі, камсамол, кваліфікацыя.

The analysis of the situation of youth in the Soviet Belarusian industry in the period of the New Economic Policy (1921–1927) is presented. Emphasis is placed on the activities of the state, Komsomol and trade unions on youth employment in the public and private industrial enterprises and protection of the rights of young workers. It is confirmed that, despite of the gradual improvement of the financial position and increase of the professionalism of the working boys and girls, they lingered long in the lowest skill category and they were often employed in unskilled work. The total number of young workers relative to the number of industrial workers remained low; the majority of young workers was Jewish and worked in small-scale industry.
**Keywords:** industry, enterprises, workers, handicraftsmen, youth, teenagers, Young Communist League, qualification.

З надыходам доўгачаканага міру адной з першачарговых задач у эканоміцы Савецкай Беларусі з’яўлялася аднаўленне прамысловасці. У гэтай важнай справе прымала ўдзел і юнацтва.

Па закліку кампартыі камсамольскія арганізацыі ў 1921–1922 гг. стваралі на бяздзейнічаючых заводах і фабрыках аднаўляльныя брыгады, праводзілі суботнікі і нядзельнікі. Маладыя рабочыя на чале з камсамольцамі прымалі дзейсны ўдзел у аднаўленні прамысловых прадпрыемстваў [1, с. 106–107].

Не заставаліся ў баку і падлеткі, да якіх адносіліся асобы ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў. Усяго ў цэнзавай прамысловасці ССРБ у чэрвені 1921 г. налічвалася 343 падлеткі (8,7 % ад усіх яе рабочых), у чэрвені 1922 г. – 185 (6,4 %), у чэрвені 1923 г. – 257 (6,2 %, што было больш чым у сярэднім па СССР, дзе гэта лічба складала 5,9 %) [2, л. 130]. Як бачым, пасля амаль двухкразовага скарачэння ў сярэдзіне 1922 г. колькасць падлеткаў у цэнзавай прамысловасці рэспублікі пачала расці, хаця і не дасягнула ўзроўню сярэдзіны 1921 г., да таго ж у працэнтных адносінах да дарослых рабочых скарачэнне яе працягвалася, што сведчыць аб цалкам зразумелым прыярыцеце прыцягнення на працу ў цэнзавую прамысловасць рабочых сталага ўзросту.

Усяго камсамольцы ў 1922 г. з дапамогай дзяржаўных і прафсаюзных органаў уладкавалі на працу ў прамысловасці ССРБ звыш 600 падлеткаў. Паспяхова праводзілася браніраванне працоўных месц для падлеткаў на прамысловых прадпрыемствах Віцебскай і Гомельскай губерняў [3, с. 120].

Пры гэтым працэнт юных рабочых на прыватных прамысловых прадпрыемствах Савецкай Беларусі ў пачатку 1920-х гг. у 3,5 разы перавышаў яго працэнт на дзяржаўных прамысловых прадпрыемствах [4, л. 36]. Гэта можна растлумачыць тым, што моладзь з’яўлялася найбольш лёгкаэксплуатуемай працоўнай сілай.

Толькі ў канцы 1922 – пачатку 1923 гг. КСМБ замацаваў становішча моладзі на дзяржаўных і прыватных прамысловых прадпрыемствах: правёў праз Народны камісарыят

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

працы (НКП) ССРБ пастановы аб нескарачальнасці юнацтва на прыватных прадпрыемствах, 6-гадзінным працоўным дні для падлеткаў і цвёрдым тарыфе аплаты працы маладых рабочых [5, л. 90–91, 99].

Аднак як у прыватнай, так і дзяржаўнай прамысловасці ССРБ не выконваліся нормы рабочых гадзін падлеткаў, у аплаце іх працы і пераводзе ў вышэйшы разрад тарыфнай сеткі адсутнічала сістэма, адміністрацыя прадпрыемстваў не звяртала ўвагі на навучанне падлеткаў прафесіям. У дзяржаўных прадпрыемствах харчовай і гарбарнай галін прамысловасці ўвогуле ўсе юныя рабочыя былі звольнены [4, л. 36], [6, л. 5].

Разам з тым, дзяржава клапацілася аб падрыхтоўцы з ліку юнацтва, у першую чаргу камсамольскага, кваліфікаваных кадраў работнікаў прафсаюзнага руху і адміністрацыі ў прамысловасці. З гэтай мэтай была ўведзена практыка камсамольцаў ва ўсіх прамыслова-адміністратыўных органах [7, л. 27].

У 1923 г. у прамысловасці ССРБ працавалі 2465 маладых рабочых ва ўзросце ад 14 да 23 гадоў [2, л. 139], што складала 7 % ад усіх прамысловых рабочых [8, л. 21]. Юнакі і дзяўчаты ў пераважнай большасці працавалі на прыватных прадпрыемствах, а ў дзяржаўнай прамысловасці налічвалася шмат падлеткаў [6, л. 16]. К сярэдзіне 1923 г. большасць юных рабочых рэспублікі знаходзілася на кваліфікаванай працы [5, л. 124]. Аднак пры гэтым большасць дзяўчат-работніц заставаліся некваліфікаванымі [6, л. 51]. Як бачым, вырашэнне праблем кваліфікаванага працаўладкавання ў прамысловасці дзяўчат адставала ад вырашэння гэтых праблем сярод юнакоў.

У 1924 г. колькасць асоб ва ўзросце ад 14 да 23 гадоў, занятых у прамысловай вытворчасці БССР, вырасла да 4152 чалавек, але іх працэнт у адносінах да ўсіх рабочых скараціўся да 4,3 % [9, л. 26]. Каб захаваць месцы для маладых працоўных, улады аслабілі падатковы ціск на саматужнікаў і дробных прадпрымальнікаў, бо 50 % юнакоў і дзяўчат ССРБ працавалі на прыватных прадпрыемствах [10, л. 11]. Саматужнікі ўвогуле вызваляліся ад падаткаў пры прыёме на працу падлеткаў [11, л. 35].

Разам з тым, сярод падлеткаў-браневікоў было шмат перарасткаў, бо іх вельмі марудна пераводзілі на сталыя працоўныя месцы. Так, у канцы 1924 г. у прамысловасці ВСНГ БССР (75 % ад усёй прамысловасці рэспублікі) сярод падлеткаў-браневікоў было 2050 перарасткаў [12, л. 40].

У 1924–1925 гг., дзякуючы прамысловаму росту, зніжэнню сабекошту прадукцыі, узняццю вытворчасці працы і рацыяналізацыі, павялічыўся прыток юнакоў і дзяўчын у прамысловасць, выраслі іх заробкі, палепшыліся працоўныя і жыллёва-бытавыя ўмовы. Аднак гаспадарнікі ў мэтах рацыяналізацыі, узняцця вытворчасці працы і скарачэння выдаткаў усяляк імкнуліся абмежаваць зарплату юнацтва і браню падлеткаў, перашкаджалі поўнаму яе запаўненню і разбраніраванню перарасткаў. У некаторых галінах вытворчасці ўвогуле назіралася выцісканне падлеткаў [13, л. 17–18], [14, л. 48–49].

Разбраніраванне перарасткаў, наяўнасць якіх з'яўлялася ў гэты час істотнай праблемай для працаўладкавання падлеткаў у прамысловасці БССР, ішло вельмі марудна з-за незацікаўленасці гаспадарнікаў і слабой настойлівасці камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый.

Са студзеня па верасень 1925 г. найбольшы рост сярэдняга разрада рабочых-падлеткаў у прамысловасці БССР адбыўся у хімічнай галіне (з 3 да 3,5), у гарбарнай галіне ён скараціўся з 3,5 да 3, а ў металаапрацоўчай застаўся на ўзроўні 3. Пры гэтым сярэдні заробак рабочых-падлеткаў вырас па ўсіх галінах (найбольшы быў у харчовай – 28 руб. 80 кап.) як і зарплаты рабочых старэйшых узростаў. У працэнтных адносінах ён вырас у харчовай (найбольш – 54,9 %), дрэваапрацоўчай (53,6 %) і хімічнай (50,9 %) галінах, а скараціўся ў металаапрацоўчай (найбольш – 29,4 %) і гарбарнай (39,9 %) [14, л. 70]. Як бачым, у сярэднім рабочыя-падлеткі мелі 3 кваліфікацыйны разрад, рост жа іх зарплаты адставаў ад заробку рабочых старэйшых узростаў у металаапрацоўчай і гарбарнай галінах.

Аднак у цэлым у прамысловасці рэспублікі юныя рабочыя падоўгу затрымліваліся ў ніжэйшых разрадах, хоць па кваліфікацыі маглі быць пераведзены ў вышэйшыя [15, л. 53, 77]. На прадпрыемствах хімічнай і дрэваапрацоўчай галін падлеткі заседжваліся ў адным кваліфікацыйным разрадзе нават год–паўтара. Увогуле моладзь у прамысловасці БССР мела нізкую кваліфікацыю, вялікая частка юнакоў і дзяўчын былі заняты на чорнай працы [13, л. 22].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

Сярод саматужнікаў рэспублікі меліся юныя наёмныя работнікі, а таксама самастойныя маладыя саматужнікі. Падлеткаў у саматужных прадпрыемствах было хоць і няшмат (каля 7 %), але больш, чым у іншых галінах прамысловасці. Колькасць падлеткаў у саматужных прадпрыемствах БССР вагался наступным чынам: май 1924 г. – 1053, ліпень 1924 г. – 635, студзень 1925 г. – 756, кастрычнік 1925 г. – 768. У кастрычніку 1925 г. 522 падлеткі (68 %) на гэтых прадпрыемствах знаходзіліся на броні. Сярод іх была значная колькасць перарасткаў, але да канца года большасць іх была пераведзена ў штат, а агульная колькасць падлеткаў у саматужных прадпрыемствах рэспублікі перавысіла 1 тыс. чалавек [14, л. 52], [16, л. 69 – 70], [17, л. 20]. Як бачым, колькасць падлеткаў у саматужнай вытворчасці не была стабільнай. Гэта можна растлумачыць прыярытэтам для саматужнікаў асабістай выгады і прыбытку, што вяло да наяўнасці сярод працуючых у іх падлеткаў-браневікоў значнай колькасці перарасткаў і адпаведна стрымлівала прыток новых падлеткаў па броні.

Эканамічнае становішча моладзі саматужных прадпрыемстваў было не вельмі добрым з-за нізкай кваліфікацыі, дрэнных умоў аховы працы і г. д. Саматужнікі імкнуліся не плаціць вучням, марудна пераводзілі юнакоў і дзяўчат у вышэйшыя разрады [16, л. 77].

На больш буйных прыватных прадпрыемствах, якія не карысталіся ільготамі за вучняў, падлеткі атрымлівалі зарплату ў адпаведнасці з дзяржмінімумам, а таксама плату па сацыяльным страхаванні, іх правы ахоўваліся на грунце кодэкса законаў аб працы. Працоўны дзень падлетка можна было падаўжаць да 8 гадзін у суткі пры ўмове захавання 36-гадзіннага працоўнага тыдня. Падлеткам забараняліся шкодныя, цяжкія і начныя працы [16, л. 74, 78, 80].

У прамысловасці БССР налічвалася значная колькасць яўрэйскіх юнакоў і дзяўчат, што заканамерна, улічваючы вялікую колькасць яўрэяў сярод насельніцтва рэспублікі. Але ў некаторых прамысловых галінах маладых яўрэяў не было ўвогуле (фарфоравая, хімічная, шкляная і інш.), што сведчыць аб выбарачным характары іх працаўладкавання, бо абмежаванняў пры прыёме на працу яўрэяў у гэты час не існавала. Разам з тым, у 1925 г. адбывалася выцясненне яўрэйскага юнацтва з традыцыйнай для яго саматужнай вытворчасці юнымі асобамі з сем’яў заможных сялян, якія добра плацілі саматужнікам за навучанне сваіх дзяцей [15, л. 163].

VIII з’езд камсамола БССР, які адбыўся ў лютым 1926 г., мабілізаваў камсамольцаў і моладзь на правядзенне індустрыялізацыі краіны і паляпшэнне работы прамысловасці. Камсамольцы разам з адміністрацыяй арганізоўвалі сярод юнакоў і дзяўчат на заводах і фабрыках конкурсы на лепшага рабочага, гурткі рацыяналізатараў і вынаходнікаў; у сценгазетах і плакатах крытыкавалі лайдакоў, прагульшчыкаў, рвачоў, п’яніц, выхоўваючы маладых рабочых у духу свядомых адносін да працы і грамадскай уласнасці. ЛКСМБ прыняў актыўны ўдзел у паходзе ВЛКСМ за сацыялістычную рацыяналізацыю і рэжым эканоміі, які адыграў важную ролю ў паспяховым правядзенні індустрыялізацыі. Камсамольцы БССР устанаўлівалі кантроль за выкарыстаннем сыравіны, ініцыявалі зніжэнне расцэнак, стваралі брыгады “сяброў станка”, якія сачылі за захаваннем абсталявання і інструментаў, а таксама камсамольска-маладзёжныя ўдарныя брыгады і цэхі, якія адыгралі важную ролю ў павышэнні прадукцыйнасці працы і ўмацаванні працоўнай дысцыпліны [18, с. 48–50], [19, л. 1].

На 1 мая 1926 г. у прамысловасці рэспублікі налічвалася 1098 падлеткаў-рабочых (7,6 % ад усіх рабочых): 662 юнакі і 436 дзяўчат. Найбольш іх налічвалася ў шкляной, тэкстыльнай і папяровай галінах (66,4 %) [20, л. 7].

Аднак колькасць падлеткаў у прамысловасці БССР на 1 верасня 1926 г. скарацілася да 1045, а іх працэнт у адносінах да ўсіх рабочых – да 6,9 %. Фактычна бронь падлеткаў у прамысловасці мясцовага значэння была больш нізкай і звыш паловы яе складалі перарасткі [2, л. 19], што, на наш погляд, і з’яўлялася асноўнай прычынай скарачэння колькасці падлеткаў-браневікоў.

Увогуле ў сувязі з агульным ростам народнай гаспадаркі ў прамысловасці БССР колькасць маладых рабочых узрасла да 5567 (28,7 %) на 1 ліпеня 1926 г. Пры гэтым рабочае юнацтва ў рэспубліцы ў большасці было яўрэйскім [21, л. 588, 625].

Была праведзена выніковая праца па прыцягненні дзяўчат у вытворчасць па ўсіх галінах прамысловасці рэспублікі [2, л. 20].

У БССР налічвалася каля 1050 маладых саматужнікаў. Усе яны былі ахоплены калектыўнымі дамовамі [22, л. 117]. Разам з тым, у лік броні на працу да саматужнікаў

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

рэспублікі пасылаліся 16–17-гадовыя падлеткі. У выніку, калі ім спаўнялася 18 гадоў, саматужнікі гублялі ільготы (гэта было зроблена, каб пазбегнуць вялікай колькасці пераросткаў сярод падлеткаў у саматужнай вытворчасці) і звальнялі вучняў, якія яшчэ не скончылі навучання [20, л. 11]. Як бачым, праблема падлеткаў-пераросткаў сярод саматужнікаў была вырашана, але ўзнікла новая праблема падлеткаў-недавучак.

Нягледзячы на існуючае заканадаўства, на некаторых прамысловых прадпрыемствах увогуле адсутнічала бронь падлеткаў ці ад яе імкнуліся ўсяляк пазбавіцца, бо яна патрабавала значных матэрыяльных выдаткаў [20, л. 4]. Такому становішчу спрыяла адсутнасць увагі да пытанняў броні падлеткаў з боку Галоўкамунгаса і Белсельсаюза, якія непасрэдна кіравалі мясцовай прамысловасцю. Да таго ж прафсаюзы і НКП БССР не вялі па гэтых пытаннях дасканалай і энергічнай працы на месцах [23, л. 4–5].

У прамысловасці рэспублікі з-за пасіўнасці гаспадарнікаў сярод падлеткаў-браневікоў па-ранейшаму мелася значная колькасць пераросткаў, што перашкаджала папаўняць бронь і ўцягваць у прамысловую вытворчасць новыя маладыя кадры. Некаторыя прамысловыя прадпрыемствы, як і саматужнікі, проста скарачалі пераросткаў [24, л. 119].

Напрыканцы 1926 г. браня падлеткаў у прамысловасці БССР была ў асноўным запоўнена. Аднак пытанне з разбраніраваннем пераросткаў заставалася вострым. Іх налічвалася ў прамысловасці саюзнага падпарадкавання 30 %, а ў прамысловасці мясцовага значэння – 50 %. Заробкі падлеткаў па ўсіх галінах узраслі, але дрэннымі заставаліся іх бытавыя і жыллёвыя ўмовы, харчаванне [21, л. 587].

Разам з тым, паступовa паляпшалася працоўная дысцыпліна сярод рабочых юнакоў і дзяўчат. Калі ў сярэдзіне 1926 г. сярод іх адзначалася слабая вытворчая дысцыпліна і зніжэнне вытворчасці працы (прагулы па некаторых прадпрыемствах даходзілі да 60 % працоўнага часу), то напрыканцы года сітуацыя выправілася і прагулы ўжо не перавышалі 10 % працоўнага часу. У юных рабочых павялічылася зацікаўленасць у працы і яе якасці, імкненне да павышэння сваёй кваліфікацыі. Але моладзь яшчэ слаба, а на некаторых прадпрыемствах увогуле не ўдзельнічала ў вытворчых нарадах і камісіях [13, л. 85].

У мэтах узняцця вытворчасці працы камсамольцы ахвотна пераходзілі са здзельнай аплаты працы на звычайную, хоць гэта і зніжала іх заробак на 30 % [13, л. 86], што сведчыць аб высокім узроўні іх самасвядомасці і гатоўнасці ахвяраваць асабістымі інтарэсамі на карысць дзяржавы і грамадства.

Увогуле дынаміка колькасці падлеткаў у прамысловасці БССР у 1925–1927 гг. выглядала наступным чынам: на 1 студзеня 1925 г. на 148 прамысловых прадпрыемствах налічвалася 864 падлеткі (6,9 % ад усіх рабочых), з іх 566 юнакоў і 298 дзяўчат (34,5 %); на 1 студзеня 1926 г. на 150 прамысловых прадпрыемствах налічвалася 1165 падлеткаў (6,8 %), з іх 772 юнакі і 393 дзяўчыны (33,7 %); на 1 студзеня 1927 г. на 223 прамысловых прадпрыемствах налічвалася 1944 падлеткі (7 %), з іх 1160 юнакоў і 784 дзяўчыны (40,3 %) [24, л. 305]. Як бачым, колькасць падлеткаў у прамысловасці рэспублікі ўвесь час расла, хаця ў працэнтных адносінах заставалася амаль нязменнай, што гаворыць аб пераважным прыцягненні на працу падлеткаў у рамках вызначаных працэнтаў броні. Працэнт жа дзяўчат сярод іх пасля нязначнага зніжэння таксама вырас, што сведчыць аб выніковасці дзяржаўнай палітыкі па павелічэнні іх колькасці ў прамысловасці. Але значная іх колькасць была занята на некваліфікаванай рабоце, а таксама ў тых галінах вытворчасці, дзе жаночая праца выкарыстоўвалася здаўна [25, л. 39].

Пры разглядзе колькасці падлеткаў-браневікоў у прамысловасці БССР без уліку пераросткаў мы убачым, што калі да снежня 1926 г. адзначаўся рост гэтай колькасці да 1215 чалавек (7,6 % ад усіх рабочых), то пасля пачалося яе зніжэнне, асабліва хуткае з сакавіка па ліпень 1927 г.: з 1206 (7,1 %) на 1 красавіка да 1165 (5,5 %) на 1 жніўня (з іх – 538 (46,2 %) дзяўчат, што з'яўляецца даволі значным працэнтам). Відавочна, што прычынай такога скарачэння з'яўлялася наяўнасць у броні вялікай колькасці пераросткаў. Так, усяго разам з пераросткамі падлеткаў-браневікоў налічвалася на 1 кастрычніка 1927 г. 1964 чалавекі (9 %), з іх пераросткаў – 799 чалавек (40,7 %) [2, л. 122], [26, л. 96]. Як бачым, у параўнанні з пачаткам года колькасць падлеткаў у прамысловасці рэспублікі некалькі вырасла, у працэнтных адносінах – нават на 2 %. Аднак пераросткі сярод іх складалі больш чым дзве пятыя.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

Але ўжо літаральна праз месяц, напрыканцы кастрычніка, у прамысловасці БССР у выніку скарачэння ці працаўладкавання пераросткаў налічвалася 1408 (6,4 % ад усіх рабочых) падлеткаў-браневікоў, з іх 571 дзяўчына (7,9 % ад рабочых-жанчын і 40,6 % ад усіх падлеткаў-браневікоў) [2, л. 5], [27, л. 72]. З гэтых лічбаў вынікае, што колькасць падлеткаў-браневікоў у прамысловасці рэспублікі так і не дасягнула ўзроўню пачатку года. Пры гэтым працэнт падлеткаў-дзяўчат адносна рабочых-жанчын перавышаў на 1,5 % агульны працэнт падлеткаў-браневікоў адносна ўсіх рабочых. Хаця колькасць падлеткаў-дзяўчат і вырасла ў параўнанні са жніўнем (што можна разглядаць як вынік узмацнення дзяржавай курсу на прыцягненне дзяўчат у прамысловую вытворчасць), аднак у працэнтных адносінах да агульнай колькасці падлеткаў-браневікоў яна скарацілася на 5,6 %. Лепш у параўнанні з астатняй прамысловасцю БССР выглядала становішча ў саматужных арцелях, дзе налічвалася 445 падлеткаў (7,8 % ад іх работнікаў) [23, л. 8].

Увогуле ў 1927 г. попыт на рабочую сілу падлеткаў у рэспубліцы быў нязначны, хаця паступова яго суадносіны з прапановай памяншаліся і колькасць падлеткаў у прамысловай вытворчасці БССР расла. Так, калі ў красавіку мелася 157 вакансій для падлеткаў, на якія прэтэндавала – 658 юных працоўных, то ў снежні адпаведна – 252 і 407. Пры гэтым 80 % попыту на падлеткавую працу прыпадала на дзяржаўныя прадпрыемствы і саматужнікаў. Да таго ж органы сацыяльнага страхавання рэспублікі штогод выдаткоўвалі 400 пайкоў на суму 38 тыс. руб. для падлеткаў, якія знаходзіліся на працы не па броні [26, л. 107].

Праведзеныя ў прамысловаразвітых акругах БССР канферэнцыі рабочых юнакоў і дзяўчат выявілі адмоўныя з’явы ў адносінах да іх з боку гаспадарчых органаў [2, л. 28]. Адзначаліся выпадкі дрэннага выкарыстання для падтрымкі падлеткаў пайкоў, магчымасцяў страхавых кас і Інспекцыі працы [25, л. 95]. На дробных прадпрыемствах 30 % моладзі працавала звыш устаноўленага законам часу. На буйных прадпрыемствах шкляной галіны падлеткі працавалі ў начныя змены [28, л. 137]. Па-ранейшаму захоўвалася праблема наяўнасці сярод падлеткаў-браневікоў у прамысловасці рэспублікі вялікай колькасці пераросткаў [29, л. 203], што можна растлумачыць нявыгаднасцю разбраніравання пераросткаў для гаспадарнікаў.

Колькасць рабочага юнацтва адносна агульнай колькасці рабочых у БССР заставалася нязначнай. Маладыя рабочыя пераважна працавалі ў дробнай прамысловасці і ў большасці былі яўрэямі па нацыянальнасці [29, л. 207, 215].

Разам з тым, сярод юных рабочых рэспублікі скараціліся прагулы, узрасла дысцыпліна і вытворчасць працы [29, л. 205, 219]. З 8,5 тыс камсамольцаў, якія працавалі на прамысловых прадпрыемствах БССР, 7,3 тыс. (88 %) былі ўдарнікамі [1, с. 150].

Такім чынам, у пачатку 1920-х гг. моладзь прымала дзейсны ўдзел у аднаўленні прамысловых прадпрыемстваў Савецкай Беларусі.

Са свайго боку дзяржава разам з камсамолам і прафсаюзамі надавала ўвагу працаўладкаванню юнацтва, але ў першую чаргу гэта датычылася асоб ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў як найбольш слабападрыхтаваных да працоўнай дзейнасці і таму патрабуючых падтрымкі, асабліва ў складаных сацыяльна-эканамічных умовах.

Аднак толькі ў канцы 1922 – пачатку 1923 гг. у выніку мэтанакіраванай палітыкі дзяржаве пры падтрымцы камсамола і прафсаюзаў удалося больш-менш умацаваць становішча моладзі на дзяржаўных і прыватных прамысловых прадпрыемствах.

У 1925–1927 гг. колькасць падлеткаў у прамысловасці рэспублікі расла, хаця ў працэнтных адносінах заставалася амаль нязменнай, што гаворыць аб пераважным прыцягненні на працу падлеткаў у рамках вызначаных працэнтаў броні. Пры гэтым у значнай колькасці галін прыярытэтным было не звычайнае працаўладкаванне падлеткаў, а навучанне іх рабочым прафесіям.

Аднак разбраніраванне пераросткаў, наяўнасць якіх з’яўлялася ў гэты час істотнай праблемай для працаўладкавання падлеткаў у прамысловасці рэспублікі, ішло вельмі марудна з-за незацікаўленасці гаспадарнікаў і слабой настойлівасці камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый.

Працягваўся рост і зарплаты моладзі ў прамысловасці БССР, не толькі ў колькасным вымярэнні, але і ў працэнтных адносінах да заробка дарослых рабочых. Усё гэта гаворыць аб выніковасці дзяржаўнай палітыкі па падтрымцы юных рабочых.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

Разам з тым, рабочае юнацтва ў прамысловасці рэспублікі падоўгу затрымлівалася ў ніжэйшых разрадах, нягледзячы на рост свайго прафесіяналізму. Вялікая частка маладых рабочых была занята на чорнай працы.

У 1926–1927 гг. у выніку мэтанакіраванай працы дзяржавы, камсамола і прафсаюзаў павялічылася колькасць дзяўчат у вытворчасці па ўсіх галінах прамысловасці БССР, але агульная колькасць рабочай моладзі (у большасці яна працавала ў дробнай прамысловасці і была яўрэйскай нацыянальнасці) адносна колькасці ўсіх прамысловых рабочых заставалася ў рэспубліцы невялікай.

Увогуле юных прамысловых рабочых Савецкай Беларусі ў разгляданы перыяд можна падзяліць на 2 групы: 1) рабочыя, якія нядаўна прыйшлі на вытворчасць (часцей за ўсё знаходзіліся пад уплывам камсамола, актыўна ўдзельнічалі ў арганізаваных ім мерапрыемствах); 2) кваліфікаваныя рабочыя, якія даўно працавалі на вытворчасці (звычайна стараніліся грамадскай працы, не давяралі камсамольцам, што сведчыць аб значных хібах саюза ў працы з юнымі рабочымі ў мінулыя гады). Пры гэтым першая група колькасна пераважала над другой.

**Літаратура**

1. Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии / Ред. кол.: А. Е.Журов [и др.]. – Минск : «Беларусь», 1975. – 536 с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 63 п. – Воп. 2. – Спр. 355.
3. Журов, А. Под руководством партии. Деятельность КПБ по созданию и руководству комсомолом Белоруссии (1918–1925 гг.) / А. Журов. – Минск : «Беларусь», 1970. – 216 с.
4. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 1. – Спр. 14.
5. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 1. – Спр. 19.
6. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 1. – Спр. 22.
7. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 1. – Спр. 5.
8. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 1. – Спр. 27.
9. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 2. – Спр. 49.
10. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 2. – Спр. 31.
11. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 1. – Спр. 30.
12. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 1. – Спр. 53.
13. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 1. – Спр. 44.
14. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 1. – Спр. 54.
15. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 1. – Спр. 49.
16. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 1. – Спр. 45.
17. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 2. – Спр. 127.
18. Жураў, А. Камсамол Беларусі ў барацьбе за соцыялізм / А. Жураў. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1957. – 76 с.
19. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 1. – Спр. 74.
20. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 2. – Спр. 211.
21. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 1. – Спр. 64а.
22. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 1. – Спр. 62.
23. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 1. – Спр. 66.
24. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 1. – Спр. 64.
25. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. – Ф. Р-5515. – Воп. 2. – Спр. 90.
26. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 2. – Спр. 544.
27. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 2. – Спр. 448.
28. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 2. – Спр. 452.
29. НАРБ. – Ф. 63 п. – Воп. 2. – Спр. 174.

Институт истории НАН Беларуси
Поступила в редакцию 08.01.2016

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ